*Гоўзіч І.М.*
***БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. XI КЛАС***



# ТЭМА 3.
# ВАСІЛЬ БЫКАЎ

1. **Знайдзіце і працытуйце самыя цікавыя выказванні** пра аповесць Васіля Быкава «Знак бяды», якія належаць вядомым дзеячам культуры.

2. **Зрабіце супастаўляльную характарыстыку** Петрака і Сцепаніды Багацькаў у выглядзе табліцы, падмацоўваючы свае тэзісы цытатамі з тэксту (табліцу працягніце самастойна).

| Пытанне | Пятрок | Пан Сцепаніда |
|---|---|---|
| 1. Партрэт | | |
| 2. Біяграфія | | |
| 3. Рысы характару | | |
| 4. Погляды, перакананні | | |
| 5. Адносіны да іншых | | |
| 6. Адносіны іншых да героя | | |

3. Падрыхтуйце вуснае сачыненне-апісанне, прысвечанае знешняму выгляду Гужа або Каландзёнка, дапоўніце слоўныя партрэты маляванымі (пажадана з дапамогай камп'ютэрнай тэхнікі).

4. Паразважайце над пытаннямі: што агульнага паміж «Знакам бяды» Васіля Быкава і «Палескай хронікай» Івана Мележа? Ці закранаецца ў «Знаку бяды» праблема «чалавек і зямля»?

5. Правядзіце **дыспут**, прысвечаны абмеркаванню пытання: Як вырашаецца праблема «чалавек і ўлада» ў рамане У. Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім…», «Палескай хроніцы» І. Мележа, творах Васіля Быкава, ці ставяцца героі Караткевіча, падобна быкаўскім, у экстрэмальныя сітуацыі, перад выбарам?

6. Складзіце **вусныя апавяданні** на тэмы: «Філасофскі змест «Знаку бяды» В. Быкава», «За што я люблю творы В. Быкава», «Васіль Быкаў і сучаснасць».

7. **На якую з прапанаваных тэм вы пісалі б сачыненне**: «Усё

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мінае — Гонар не мінае…», «Рыцар свабоды і сумлення», «Пятрок і Сцепаніда: героі ці ахвяры», «Шлях чалавека да здрады ў аповесцях Васіля Быкава». Свой выбар абгрунтуйце.

8. **Складзіце віктарыну** паводле выказванняў герояў аповесцей «Сотнікаў» і «Знак Бяды» на тэму «Хто прамаўляе гэтыя словы?».

9. **Праглядзіце фільм** Ларысы Шапіцька «Узыходжанне» па аповесці Васіля Быкава “Сотнікаў” і падумайце, чаму ён так называецца.

10. **Уявіце, што вам давялося сустрэцца** з героямі твораў Васіля Быкава, якія пытанні вы б ім задалі, напішыце прагназуемыя адказы на іх.

| **Герой** | **Твор** | **Пытанне** | **Адказ** |
|---|---|---|---|
| Пятрок | | | |
| Сцепаніда | | | |
| Гуж | | | |
| Сотнікаў | | | |
| | | | |

11. Дапамажыце кветцы аднавіць пялёсткі, у якіх пазначаюцца назвы твораў Васіля Быкава:




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ